

Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

НАША СЛОВА



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 46 (585) 4 СНЕЖНЯ 2002 г.

І гучала беларускае слова

6 снежня ў Лідскім гарадскім доме культуры адбылася прэзентацыя кнігі Мар'яна Баяровіча "170 беларускіх народных песень Гродзеншчыны, запісаных М. А. Баяровічам", прымеркаваная да 70-годдзя аўтара.

Прэзентацыя вылілася ў сапраўднае свята беларускага слова, беларускай народнай песні, беларускай культуры. Як бы і не было ніколі той дзікай русіфікацыі, не было стагоддзяў занядбання беларускай мовы. Гэта было свята, на якім нават яўрэйскі ансамбль "Шалом", адыграўшы запісаную Мар'янам Баяровічам у Радуні "Польку-шабасоўку", заспяваў на беларускай мове " Калыханку". Прагучала шмат песень, запісаных М. Баяровічам у выкананні гурта "Калі ласка", вучняў Лідскай музычнай школы, навучэнцаў Лідскай музычнай навучальні. Юбіляра, які, дарэчы, з'яўляецца кіраўніком Саюза музычных дзеячоў Лідчыны і сябрам Лідскай раённай рады ТБМ, віншавалі шматлікія афіцыйныя і не вельмі афіцыйныя асобы. Ад Таварыства беларускай мовы шчырага беларуса Мар'яна Баяровіча віншавалі старшыня Лідскай раённай арганізацыі ТБМ Лявон Анацка і намеснік старшыні Лідскай гарадской арганізацыі ТБМ Міхась Мельнік.

Яраслаў Грынкевіч.

170 беларускіх народных песень Гродзеншчыны, запісаных М.А.Баяровічам



Ля мікрафона Мар'ян Баяровіч

Сябры, патрэбна Ваша дапамога!

У гэтым годзе, як ніколі раней ў апошнія гады, ТБМ актывізавала сваю дзейнасць, якая вымагала значных фінансавых выдаткаў. Толькі сёлета мы выдалі шэсць каляровых каляндарыкаў і плакатаў з выявамі Браніслава Тарашкевіча, Міхася Ткачова, Ігната Дамейкі, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Былі выраблены значкі (два варыянты) "Размаўляй са мной па-беларуску". Рэгулярна выходзіць "Наша слова", і ўжо пабачылі свет чатыры нумары новай газеты "Новы час". Значныя фінансавыя выдаткі пайшлі на правядзенне ў верасні месячніка "Размаўляем па-беларуску". І гэты спіс спраў, якія патрабавалі выдаткаў, можна доўжыць...

На жаль, усе нашыя фінансавыя магчымасці скончыліся, і ТБМ апынулася на мяжы закрыцця, бо для нармальнага функцыянавання нашай сядзібы патрэбна сума, эквівалентная 400-500 умоўным адзінкам у месяц.

Таму я і звяртаюся да Вас, сябры, з просьбаю аб тэрміновай дапамозе.

Па-першае, шмат хто не заплаціў сяброўскія складкі. Нагадваю, што тыя, хто працуе, плацяць у год 2.000 рублёў, беспрацоўныя, студэнты і пенсіянеры – 1.000 рублёў, школьнікі – 400 рублёў. Шмат хто можа нам дапамагчы, калі замовіць пасведчанне. Прапануем пасведчанні двух тыпаў: з фотаздымкам – 2.000 рублёў, без фотаздымка – 1.500 рублёў. На сёння мы выдалі паўтары тысячы пасведчанняў, пры наяўнасці ў нашых шэрагах больш за 10.000 чалавек.

Акрамя таго, спадзяёмся на ахвяраванні ад Вас і Вашых сяброў у любых, **нават самых сімвалічных** памерах. Імёны лабрадзеяў рэгулярна друкуюцца ў "Нашым слове".

Нагадваем, што вашыя ахвяраванні можна пералічыць на разліковы рахунак ТБМ № 3015212330014 у МГД ААТ "Белінвестбанк" г. Менска, код 764 альбо выслаць паштовым пераводам на адрас:ТБМ імя Ф.Скарыны, 220005, Менск, вул. Румянцава, 13. Каб аблегчыць Вашу працу, мы друкуем узоры квіткоў для ашчадных банкаў для ахвяраванняў і сяброўскіх складак (унёскаў). Пры гэтым паштовы збор за перасылку не бярэцца. Жыхары Менска, сябры, якія па нейкай справе наведалі сталіцу, могуць прынесці свае ахвяраванні непасрэдна ў сядзібу.

Хачу таксама падкрэсліць, што ўсе нашыя звароты да розных грантадаўцаў плёну не даюць, бо замежнікі фінансуюць толькі "рускамоўных" дэмакратаў. Таму спадзяванне толькі на вас, дарагія сябры.

Чакаю Вашай падтрымкі.

З павагай

Старшыня ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" Алег Трусаў.

(Квіткі надрук. на ст. 3.)

Калі за адраджэнне мовы, чытай, спадарства, "Наша слова"!

Шаноўнае спадарства, сябры ТБМ! Ідзе падпіска на газету ТБМ "Наша слова" на першае паўгоддзе 2003 года.

Кошт падпіскі на першы квартал, нават знізіўся. Праўда, гэтае зніжэнне наўрад ці прыцягне шмат новых падпісчыкаў. Іх можа даць толькі павышэнне актыўнасці грамадзян і паваротам іх да беларускай мовы. А гэта ў многім залежыць ад актыўнасці арганізацый і сяброў ТБМ.

Мы просім усе арганізацыі ТБМ, як мага актыўней, правесці падпіску на газету "Наша слова", падпісаць яе для бібліятэк і школаў сваіх гарадоў і раёнаў. Але асабліва яшчэ раз мы просім, каб кожны сябар ТБМ падпісаўся сам і падпісаў свайго блізкага і знаёмага. Падпіска дасць нам магчымасць пратрымацца некалькі месяцаў. За гэты час мы спадзяёмся папраівіць свае справы.

Беларуская мова- ТБМ наша будучыня

Ахвяраванні на ТБМ

1. Маскаўская суполка ТБМ 1720 рас. р.
2. Казлоўская І., г. Менск 1100 р.
3. Уладзімір Міцкевіч, г.Менск 5000 р.
4. Удзельнікі шэсця 17 верасня, г. Менск 28279 р.
5. Аляксандра Фурс г. Паставы 5000р.
6. Шкірманкоў Фелікс г.Слаўгарад 5000р.
7. Талуць С., г. Гомель 3000 р.
8. Сазонаў Анатоль, г. Слуцк 1000 р.
9. Палсцюк Валеры, г. Менск 5000 р.
10. Чэчат Алесь, г. Менск 10000 р.
11. Грэская Браніслава, г. Менск 5 дол.
12. Авіжвіч Мікалай, г. Менск 1000 р.
13. Петруковіч Васіль, г. Менск 9000 р.
14. Згіроўскі Дзмітры, г. Менск 100 рас. р.
15. Мальдзіс Адам, г. Менск 4000 р.
16. Суполка "Народная воля" г. Менск 27000 р.
17. Бекіш Віктар, г.Менск 1000 р.
18. Заводская рада, г. Менск 270 р.
19. Цыганкоў Сяргей 3000 р.
20. Умрэйка Іван 3000 р.

Просім Вашыя ахвяраванні дасылаць на адрас: вул. Румянцава 13, г.Менск, 220005, альбо пералічыць на разліковы рахунак ТБМ № 3015212330014 у Менскай гардырэкцыі ААТ Белбізнесбанка код 764 праз любое аддзяленне ашчадбанка Беларусбанк (камісійны збор пры гэтым не бярэцца).

Віншаванні ад ТБМ

Сакратарыят ТБМ віншуе з днём народзінаў сяброў ТБМ, якія прыйшлі на свет у снежні

Іну Берняковіч
Зміцера Буданава
Ніну Галіноўскую
Віталя Гарановіча
Радзіма Гарэцкага
Алега Гнятулю
Тараса Грыца
Браніславу Грэскую
Уладзіміра Гука
Галіну Дашкевіч
Таццяну Дзем'яновіч
Юлю Дрозд
Наталлю Жучкову
Кацярыну Жыткавец
Ларысу Казачок
Сяргея Краўчука
Алеся Дозку
Алега Лук'янцава
Аляксандра Панцялея
Віталя Станішэўскага
Андрэя Цыву
Міколу Шэпетава

Ф. СП - 1

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету / часопіс **63865** (індэкс выдання)

НАША СЛОВА (назва выдання)

На 2002 год па месяцах:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
X	X	X									

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТАЧКА

ПВ	месца	літар

на газету / часопіс **63865** (індэкс выдання)

НАША СЛОВА (назва выдання)


Кошт	падпіскі	1374 руб.	Колькасць камплектаў	1
	пераадрасоўкі	руб.		

На2002 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
X	X	X									

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозвішча,ініцыялы)



Анатоль Літвіновіч

З ВОСТРЫМ СЛОВАМ МІЖ БРАТАМІ

(Працяг. Пачатак у папярэднім нумары.)

Безумоўна, якімі б блізкімі не былі паміж сабой беларусы і расійцы, аднак паміж імі існавалі адрозненні, фармаванню якіх садзейнічалі прыродна-кліматычныя, дзяржаўныя, ваенна-палітычныя, гістарычныя, эканамічныя, сацыяльныя, ідэалагічныя, культурныя, этнічныя і іншыя фактары. Як і кожны народ, рускія маюць шмат станоўчых якасцяў і рыс характару. Аднак у беларускай парэміялогіі, як не дзіўна, наайбольш захаваліся такія вусна-паэтычныя выразы, якія адлюстроўваюць не столькі пазітыўныя, колькі негатыўныя якасці нашых усходніх суседзяў. Да падобных твораў трэба падыходзіць з разуменнем, бачыць у іх праяўленне жыццядольнасці і жыццялюбства народа, яго здаровага гумару, багатай фантазіі і назіральнасці.

Не заўсёды нашым продкам падабаліся залішняя хітрасць, хлуслівасць, высакамер'е, практыцызм і, нарэшце, пагарджанне інтарэсамі супрацьлеглага боку, характэрныя нярэдка прадстаўнікам (асабліва падобныя якасці ўласцівы былі гандлярам і купцам) нашага ўсходняга суседа. Таму зусім не на пустым месцы ў беларусаў ўзніклі выразы, тыпу: "Тату, тату, лезе чорт у хату. – Дарма, абы не маскаль"; "Тату, тату, лезе чорт у хату. – Няхай лезе, абы не маскаль". Дарэчы, падобныя прыказкі ўласцівы і ўкраінскаму фальклору.

Часам у рускіх (у прыватнасці, раскольнікаў), якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі, Латвіі, Летувы, прадпрымальнасць, практыцызм, дзелавітасць набывалі крайнія формы (гэта вылівалася ў канакрадства і іншыя віды зладзейства). У беларусаў адносна гэтай катэгорыі рускага насельніцтва мелася некалькі вусна-паэтычных выразаў, адным з якіх з'яўляецца наступны: "На тое маскаль, каб краў".

Цяжкі гістарычны лёс беларусаў (тут гаворка ідзе пра ХУІІ-ХІХ стст., і маюцца на ўвазе сяляне, гарадская беднята, дробная шляхта) сфармаваў ў іх такія рысы, як асцярожнасць і недаверлівасць да прадстаўнікоў іншых народаў (напр. цыганоў, яўрэяў, немцаў) і сацыяльных груп насельніцтва сваёй этнічнай супольнасці (напр. памешчыкаў, гандляроў, купцоў). Таму і не дзіўна, што нашы продкі ў мінулым з недаверлівасцю і падазронасцю адносіліся да продкаў сучасных расійцаў. Пра гэта сведчаць, да прыкладу, прыказкі: "З маскалём знайся, да толькі камень у пазусе дзяржы" (польск. "С москотамі дружы, а камень за пазухой дзержы). Украінцы ж аналагічныя выразы выкарыстошвалі не толькі ў адносінах рускіх: "З москалем бувай, а камень в пазусі трымай", але і беларусаў: "З літвіном братайся, да камень держы". М. Федароўскі таксама характарызуе адносіны беларуса з расіянінам, як асцярожныя і недаверлівыя: "...у той жа час выгляд вялікарасіяніна з яго суровасцю і шырокай натурай" і з усімі так добра нам вядомымі недахопамі для яго грозны, узбуджае ў беларуса асцярожнасць лі загадвае, як мага даўжэй яго пазбягаць". Нягледзячы на тое, што рускія карысталіся аўтарытэтам у нашага народа, аднак беларусы не заўсёды давяралі сваім усходнім суседзям, а да іх слоў часам прыслухоўваліся з падазронасцю. Пра гэта сведчаць наступныя прыказкі: "Калі маскаль кажа суха, то падніМайся да вуха: бо ён брэша", "Маскаль не вялікі пан, ды ў яго барабан" (г. зн. што ён небяспечны; праўда, тут гаворка пра салдата). Ды некаторыя іншыя якасці і рысы характару (умяшанне ў чужыя справы, прывязчывасць, празмерная прыдзірлівасць, навязванне свайго пункту гледжання іншым людзям і т. д.) не заўсёды падабаліся (праўда, такое было ўласціва толькі частцы нашых усходніх суседзяў) беларусам у рускіх: ("Муціць у вадзе, як маскаль у сяле" (г. зн. салдат – А. Л.), "Во, прывязка маскоўская!", "Маскоўская прывязка", "Ад чорта адхрысцішся; ад маскаля не адмолішся: ад маскаля палы ўрэж, ды ўцякай" (колькі народнага гумару, сатыры, аптымізму выказана ў гэтых і вышэй згаданых намі вуснапаэтычных выразах!)

Беларусы маюць цэлы шэраг прыказак і прымавак, у якіх хоць і згадваюцца словы ***маскаль***, ***маскалі***, якія не маюць, аднак, наўпростых адносін да рускіх. Праўда, што тычыцца наступнай: "Зтуль маскалі, а зтуль швэды, недзе дзецца з велькай беды", запісанай М. Федароўскім ў Ваўкавыскім павеце, то яна спачатку, безумоўна, мела адносіны да гістарычных падзей (Паўночнай вайны 1700-1721 гг.), калі беларусы аказаліся ў незайздросным становішчы, паміж молатам і кавадлам. Пазней жа першапачатковы сэнс быў забыты і сувязь з гістарычнымі рэаліямі была страчана. Таму польскі фальклярыст тлумачыць яе наступным чынам: "Калі чалавек знаходзіцца ў цяжкім становішчы – абкружаны з усіх бакоў цяжкасцямі".

Вось яшчэ адзін вусна-паэтычны выраз (і яго блізкія варыянты), якія не маюць наўпростых адносін да рускіх: "Ні за тое маскаля б'юць, што ўкраў, але за тое, што кепска схаваў", "Не за тое маскаля б'юць, што крадзіць, а што канцоў не хавaець", "Не за тое маскаля б'юць, што крадзіць, а на тое штоб умеў схаваць". І. Насовіч сэнс гэтай прыказкі бачыць ў наступным: "Гаворацъ у павучанне рабіць усякую справу з разважлівасцю".

На Беларусі ў ХІХ ст. ужывалі не толькі гістарычную прыказку "Масква слязам не верыць", але і аналагічную ёй іншую: "Маскаль слёзам не верыць". Яны могуць ўказваць, у сваю чаргу, на жорсткасць, адсутнасць спачування да простага чалавека, уласны інтарэс і прагматызм, якія часам уласцівыя некаторай частцы (мажліва, сталічнай або вайсковай) рускіх.

У некаторых выпадках расіяніна, або рускага салдата, на Беларусі нават не лічылі за чалавека: "Свіння не статак, маскаль не чалавек", "Маскаль не чалавек, з'есць усё" Узнікненне гэтых прыкыазак (асабліва першай), магчыма, можна аднесці да таго часу (ХУІ-ХУІІ стст.), калі літоўска (фактычна беларуска – А.Л) – маскоўскі-канфлікт дасягнуў свайго апагею, калі продкі сучасных беларусаў і расіян мелі даволі высокую этнічную самасвядомасць і годнасць (асабліва гэта датычыць вышэйшых станаў грамадства), калі тагачасных беларусаў страшэнна абурала "пыха маскавітаў пры поўным іх невуцтве і нежаданні ўспрымаць асвету ў якім-кольвек выглядзе" (Я. Прыбытка).

У рускіх захавалася нямала прыказак, прымавак, іншых трапных народных выразаў, у якіх адлюстраваны гістарычныя асобы, падзеі, звязаныя з "Литвой", "литвинами" і "литовцами" (тут маюцца на ўвазе беларусы). Так, напр., у Наўгародскай губерні "Лисой Патрикеевной" называлі ўсякага пранырлівага і двурушнага чалавека па імені літоўскага князя Патрыкея Нарымонтавіча., які ў ХІУ ст. пасеяў у асяроддзі наўгародскіх грамадзян смуту і варажнечу. Верагодна, да яго адносіцца прымаўка: "Патрикей сам третей".

(Працяг у наст нумары.)

І ДУШОЮ, І СЛОВАМ БЫЦЬ З ВАМІ...

Ці даўно, здаецца, мы ўсе з хваляваннем і трывогай перажывалі за нашых літаратараў і іх нечарговы 14-ы з'езд, а сёння гэта ўжо нібыта і пройдзеная гісторыя, хоць яшчэ не зляжалая, а зусім свежая, нібы складзенае ў капу перад даждЖом сена, і не астыўшая яшчэ ў нашай памяці... Так, гісторыя, няхай і невясёлая, і не да канца яшчэ акрэсленая і асэнсаваная, але што было, тое было і ёсць... Ад саміх сябе, кажуць, нікуды не ўцячэш і не дзенешся... Тым больш, калі на рэчы і ўсе працэсы ў грамадстве глядзець у адным звязку, як кажуць мае калегі, сінхронна, то гэтае было і ёсць не што іншае як водгулле, хоць і слабае рэха менавіта ўсяго таго, што адбываецца зараз вакол... Праўда гэтае было быллём не парасло, як бы ні стараўся наш імклівы хуткацечны час нешта зглядзіць і залізаць, аддаць забыццю. Ён, гэты час, зусім тут не валадар над тым, што ўжо адбылося. На яго стрыжні, а перш - на становішчы нашай літаратуры, а мо і над лёсамі саміх многіх яе творцаў яшчэ доўга, як той чарнобыльскі указальнік – SOS, будзе вісець і гойдацца пад ветрам той жа гісторыі "знак бяды".

Яшчэ, дзякаваць Богу, што хоць фармальна расколу, як такога, на самім з'ездзе не адбылося. Але ж ён ужо маячыў на гарызонце і сваім разбуральным плугам усё-такі прайшоўся па літаратурным беларускім полі, зрабіў глыбокую не тое што баразну, а рану-разору ў душах і сэрцах яго самых руплівых і шчырых сейбітаў, а калі глядзець шырэй, то і ўсёй творчай інтэлігенцыі нашай спакутаванай Бацькаўшчыны.

І вельмі разумна і дарэчы, што ў гэты цяжкі для беларускіх пісьменнікаў час іх аднадушна падтрымалі чытачы-сябры Гарадзенскага гарадскога грамадскага аб'яднання ветэранаў вайны, працы і ўзброеных сілаў (такі зараз яго афіцыйны назоў), выступіўшы ў друку ў абарону беларускай літаратуры і асабліва яе прагрэсіўных творцаў начале з Вольгай Іпатавай, на каго зусюль, як на паляванні, ледзь не крычалі "ату!".

Апроч таго, ветэраны вайны гэтага аб'яднання асобна накіравалі ў адрас з'езду яшчэ і свой зварот з просьбай-заклікам да ўсіх сяброў Саюза пісьменнікаў апамятацца, спыніць усе звадуі-сваркі і "пакінуць усё дрэннае за дзвярыма з'езду"

Усё гэта было не проста чытацкая нераўнадушнасць да таго, што адбываецца сёння ў пісьменніцкім Саюзе, а гарачае шчырае жаданне хоць словамі падтрымкі неяк дапамагчы ім у гэты нялёгкі для іх, як і для ўсіх нас час.

З неаслабнай увагай сачылі гарадзенскія чытачы-ветэраны і за тым, як працаваў з'езд, у якім кірунку і атмасферы ішла гэтая праца, якія яе першыя вынікі?

І вось калі з'езд адбыўся і патроху ўлягліся вакол яго жарсці яны рашылі запрасіць групу творцаў начале з Вольгай Іпатавай да сябе ў Горадню на сустрэчу. Вольга Міхайлаўна і яе калегі па пяру ахвотна адклікнуліся на запрашэнне і такая сустрэча ў горадзе на Нёмане днямі адбылася.

На вечарыну ў невялікую, але хораша маляўніча аформленую залу, дзе яна праходзіла, прыйшлі не толькі такія паважаныя ў горадзе ветэраны вайны і працы як Леанід Закурдаеў, Аляксандр Шаўчук, Канстанцін Дзядзель, Аляксандр Талерчык і іншыя, але і сябры моладзевага Цэнтра культуры імя Каліноўскага, што створаны пры ветэранскім аб'яднанні, а таксама сябры літаратурна-творчых і фальклорных гурткоў, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры. Усім цікава было даведацца чым жа жывуць нашы беларускія пісьменнікі пасля з'езду, што іх клапоціць і хвалюе і, вядома ж, паслухаць іх творы. І ўсё гэта атрымаць не са старонак друку і сродкаў масмедыя, а непасрэдна з вуснаў саміх творцаў, такіх вядомых літаратараў як наша зямлячка Вольга Іпатава, Сяргей Законнікаў, Міхась Скобла, выступы якіх неслі ў сабе і пасялялі ў людскія сэрцы вялікі выхаваўчы зарад беларускасці, аптымізму і веры ў нашу нацыянальную ідэю і лепшае заўтра. Празаік Барыс Пятровіч (Сачанка) распавёў прысутным пра новае літаратурна-мастацкае і публіцыстычнае выданне "Дзеяслоў", галоўным рэдактарам якога ён з'яўляецца і прэзентацыя якога адбылася 12 лістапада ў Доме літаратара ў Менску. Паэт – бард Эдуард Акулін з патрыятычнай узнёсласцю і разам з тым задушэўнасцю і тонкім лірызмам выканаў свае вядомыя песні "Малітва" і "Пагоня".

Арганізатар сустрэчы старшыня Рады ветэранскага аб'яднання Мікола Мельнікаў у сваю чаргу расказаў сталічным гасцям як жыве і працуе аб'яднанне над сваім і культурна-асветніцкімі і сацыяльнымі планамі і задумкамі на ніве беларускага нацыянальнага Адраджэння. "Мажлівасці нашы зусім абмежаваныя, можна сказаць ніякія, - падкрэсліў напрыканцы ён. – Але рашучасць і жаданне рупіцца, працаваць на беларускую нацыянальную ідэю, дзеля лепшага жыцця ў шмат крат памнажае нашы высілкі. А галоўнае тое, што ў гэтай святой справе мы і душою, і словам імкнемся быць з вамі, каб урэшце ўсе ў нашай шматпакутнай старонцы сталі "людзьмі звацца", як пра тое марыў, як таго хацеў наш несмяротны геній Янка Купала".

У канцы сустрэчы шаноўныя госці падпісалі чытачам, удзельнікам вечарыны свае кніжкі і разам сфатаграфаваліся ў знак гэтай незабыўнай цёплай сустрэчы.

Нельга не сказаць колькі слоў і пра тое, што перад гэтым у першай палове таго ж дня такія сустрэчы беларускіх літаратараў з чытачамі адбыліся ў Гарадзенскім дзяржуніверсітэце імя Янкі Купалы, каледжы мастацтваў і аграрным універсітэце, дзе іх выступленні пад назовам "Свабоднае грамадства – свабодная творчасць" прайшлі таксама з вялікім поспехам.

Аляксей Дземідовіч.



Доўга чакалі ўводу ў эксплуатацыю сацыяльна культурнага комплекса ў вёсцы Немержа Драгічынскага раёна. На сёння тут размяшчаюцца сельскі савет, праўленне калгаса "Іскра", клуб і бібліятэка, вузел сувязі і пошта і інш.

На здымку: у бібліятэцы. **Фота Рамана Кабяка, БелТА.**

Імпрэза ў Баранавічах



Баранавічы. 10 лістапада 2002 года. Імпрэза прысвечаная 120-м угодкам з дня народзінаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Алег Трусаў уручае падзяку Галіне Ярашэвіч за актыўны ўдзел у справе адраджэння беларускай мовы і традыцый беларускага народа.

10 лістапада ў Баранавічах адбылася імпрэза, прысвечаная 120-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мерапрыемства праходзіла ў вялікай зале Палаца тэкстыльшчыкаў.

Надзвычай парадаваў прысутных канцэрт, перасыпаны вершамі, песнямі, танцамі ў майстэрскім выкананні таленавітых дзяцей і моладзі. Баранавіцкая арганізацыя ТБМ, якая ладзіла імпрэзу, уганаравала падзякамі за актыўную грамадскую дзейнасць паэтаў, рэдактараў газет, часопісаў, а таксама сваіх сяброў. А пераможцы віктарыны, якую сумесна праводзілі ТБМ і радыё нечакана для сябе атрымалі грашовыя ўзнагароды і кнігі.

У імпрэзе бралі ўдзел наш вядомы паэт Г. М. Бураўкін, які пазнаёміў усіх з новымі вершамі, старшыня ТБМ А. А. Трусаў, які распавёў пра дзейнасць рэспубліканскай арганізацыі. Напрыканцы выступіла намеснік старшыні ТБМ А. Анісім з паведамленнем пра канцэпцыю газеты "Новы час", галоўным рэдактарам якой яна з'яўляецца.

United World Colleges

БЕЛАРУСКІ КАМІТЭТ КАЛЕДЖАЎ МІЖНАРОДНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

абвяшчае конкурс на атрыманне бясплатных стыпендый у Міжнародных каледжах у Нарвегіі і Італіі.

Узрост абітурыентаў: 16-17 гадоў (16 гадоў павінна споўніцца да 1 верасня 2003 года).

Конкурс адбываецца ў тры туры.

I тур: абітурыенты павінны даслаць да 15 лютага 2003 г. заяву з пазначэннем свайго адраса, кантактнага тэлефона і нумара школы, даведку аб стане здароўя, лісты паспяховасці за мінулы і гэты навучальныя гады, звесткі аб удзеле ў вучнёўскіх алімпіядах, мастацкай самадзейнасці, спартовых секцыях, копіі грамат, дыпломаў, публікацыі ў прэсе і іншыя дакументы, якія сведчаць пра навуковую і творчую дзейнасць.

II тур: 28 лютага 2003 г. Эсэ на зададзеную тэму на англійскай ці беларускай мове.

III тур: 19 красавіка 2003 г. Тэст на выяўленне агульнага інтэлектуальнага ўзроўню і сумоўе на беларускай і англійскай мовах.

У кожным наступным туры маюць права ўдзельнічаць толькі пераможцы папярэдняга тура, пра што ім будуць дасланыя паведамленні

Дакументы на конкурс просім дасылаць на адрас:

220050, Мінск, вул. Кірава, 21 з паметкай "Конкурс:.

Вольны час – з роднай песняй

Гарадзенская абласная арганізацыя ТБМ пры дабрачыннай падтрымцы грамадскага аб'яднання "Ратуша" падрыхтавала і выдала "Беларускі сьпеўнік". Складальнікі зборніка, сябры Таварыства Алесь Міцюкевіч і кампазітар Яўген Петрашэвіч сабралі пад адной вокладкай песні розных жанраў. Большасць з іх – беларускія народныя, шырока вядомыя ў нашай краіне. У зборніку некалькі раздзелаў: "Патрыятычныя", "Спявайце, братцы, спявайце!", "Жартоўныя", "Гуляць – дык гуляць!", "Колькі ў небе зор!"

Зборнічак мае кішэнны фармат. Ён зручны ў карыстанні.

Спявайце беларускае, бо, як кажуць, песня – душа народа.

Наш кар.



Канферэнцыя ТБМ у Магілёве

23 лістапада адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя Магілёўскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны". Канферэнцыя выклікала вялікую цікавасць: аркамя дэлегатаў у ёй бралі ўдзел каля двух дзесяткаў гасцей з розных грамадскіх аб'яднанняў Магілёва і Менска.

Дэлегаты канферэнцыі заслухалі і абмеркавалі справаздачны даклад старшыні арганізацыі Міхася Булавацкага, выказалі заўвагі і прапановы па пашырэнні дзейнасці арганізацыі. Старшынёй абласной арганізацыі абрана Наталля Лебедзева, выкладчыца кафедры беларускай літаратуры Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова. Канферэнцыя пашырыла склад абласной рады з пяці да адзінаццаці чалавек.

Дэлегаты канферэнцыі аднагалосна прынялі заклік да міністэрства адукацыі больш актыўна спрыяць пашырэнню беларускамоўнай адукацыі, выказалі незадавальненне тым, што магілёўскія ўлады не ўшаноўваюць помнікамі на плошчах абласнога цэнтра славутых землякоў, якія працавалі на ніве беларускай мовы і беларускай культуры, і даручылі новаабранай радзе звярнуцца з прапановай да абл- і гарвыканкама па ўсталяванні ў Магілёве помнікаў Максіму Гарэцкаму і Цішку Гартнаму.

Наш кар.

Бланкі для пералічэння сяброўскік складак і ахвяраванняў на ТБМ

Паведамленне

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" УНП 100129705
атрымальнік плацяжу
Мінская гарадская дырэкцыя ААТ "Белінвестбанка"
назва банка
Рахунак атрымальніка **3015212330014** Асабовы рахунак **764**
(прозвішча, імя, імя па-бацьку, адрас)

Від плацяжу			Дата	Сума
Сяброўскія ўнёскі за 2002 год				
			Пеня	
			Разам	

Касір

Плацельшчык

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" УНП 100129705
атрымальнік плацяжу
Мінская гарадская дырэкцыя ААТ "Белінвестбанка"
назва банка
Рахунак атрымальніка **3015212330014** Асабовы рахунак **764**
(прозвішча, імя, імя па-бацьку, адрас)

Від плацяжу			Дата	Сума
Сяброўскія ўнёскі за 2002 год				
			Пеня	
			Разам	

Квітанцыя

Касір М.П.

Плацельшчык

Паведамленне

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" УНП 100129705
атрымальнік плацяжу
Мінская гарадская дырэкцыя ААТ "Белінвестбанка"
назва банка
Рахунак атрымальніка **3015212330014** Асабовы рахунак **764**
(прозвішча, імя, імя па-бацьку, адрас)

Від плацяжу			Дата	Сума
Ахвяраванні на дзейнасць ТБМ				
			Пеня	
			Разам	

Касір

Плацельшчык

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" УНП 100129705
атрымальнік плацяжу
Мінская гарадская дырэкцыя ААТ "Белінвестбанка"
назва банка
Рахунак атрымальніка **3015212330014** Асабовы рахунак **764**
(прозвішча, імя, імя па-бацьку, адрас)

Від плацяжу			Дата	Сума
Ахвяраванні на дзейнасць ТБМ				
			Пеня	
			Разам	

Квітанцыя

Касір М.П.

Плацельшчык

Гучная імпрэза

ЯК ПАСЯБРАВАЛІ "ЧАТЫРЫ ПАЛЯКІ, ГРУЗІН І "N.R.M."

Фестываль "Восень польскай культуры", які быў арганізаваны Інстытутам Польскім у Менску, яшчэ доўжыцца. Але ўжо сёння можна смела казаць, што бадай самай гучнай ва ўсіх адносінах яго акцыяй стаў сумесны канцэрт беларускіх і польскіх рок-гуртоў. А названая была гэтая імпрэза, якая адбылася ў парк-клубе "Менск", з гумарам: "Тры палякі, грузін і сабакі". Бачна, што арганізатары мелі на ўвазе гераічную тэле-эпапею бравага экіпажа брыгады імя Тадэвуша Касцюшкі – "Чатыры танкісты і сабака".

Першым удзельнікам акцыі стаў вядомы польскі бард Яцэк Клейф і ягоны аркестр "Na Zdrowie". А сваю канцэртную праграму музыкант распачаў з беларускай тэмы – песняй на вершы Леаніда Дранько-Майсюка з рэпертуару Зміцера Вайцюшкевіча "Памяркоўны мядзведзь": ***"Я люблю сваю выгоду, ёлкі, хвоі і дубы. Але ўсё ж за лыжку мёду я прадамся ў цырк любы"***. Для беларускіх слухачоў ён выканаў і сваю версію хіта гурта "Animals", вядомую як "Дом узыходзячага сонца". Іншы бок творчасці спевака – драматычны – была агучана ў "Песні пра Бруна Шульца". Музыка прыцягнуў ўвагу да сваёй творчасці аматараў інтэлектуальнай музыкі ды палітызаваных тэкстаў, характэрных для дысідэнцкіх выканаўцаў часоў польскай "Салідарнасці". Невыпадкова, што самымі зацікаўленымі слухачамі на гэтым канцэрце сталі вядомыя беларускія барды Віктар Шалкевіч і Алесь Камоцкі.

Зусім іншы гук і шарм прапанавалі слухачам удзельнікі іншай польскай фармацыі – гурта "Pidzama porno". Хоць назву хлопцы выбралі і правакацыйную, але гурт так і выпраменьвае станоўчую энергетыку, прыпраўленую добрым гукам і заваднымі мелодыямі. Рэпертуар гурта ўпрыгожвалі свае кампазіцыі, з якіх выкпікалі захапленне рытмічныя панк-кампазіцыі "Antifa", "Мы застанемся тут", каверы з рэпертуару класікаў рок-н-ролу...

Наступнага госця беларускай сталіцы было прапанавана прадставіць удзельнікам гурта "N.R.M." Але як толькі на сцэне з'явіліся "энэрэмаўцы" Лявон Вольскі і Алег "Алезіс" Дземідовіч, публіка пачала патрабаваць куміраў на сцэну – гурт "N.R.M." І ў доказ сваёй любові стала выконваць беларускі хіт усіх часоў – "Партызанскую песню". Лявон і Алег нагадалі, што гасціннасць – рыса таксама і беларуская. Тым больш, што на сцэну рыхтавалася выйсці яшчэ адна польская каманда першага эшалона – "T.Love", што ў перакладзе адзначае "альтэрнатыўнае падлеткавае каханне". І каб абвергнуць усе інсінуацыі адносна сваіх сексуальных прыхільніцяў, польскія хлопцы выканалі рытмічную песню з красамоўнай назвай: "Мы нармальныя!"

Гэта песенька трошкі супакоіла публіку і тая пад музыку "T.Love" пайшла ў звычайныя клубныя скокі "цягнічком" ды пацягвала піва ў чаканні самай галоўнай падзеі вечара ў парк-клубе "Менск". А гэтым часам музыкі "T.Love" радавалі новымі песнямі ды каверамі, якія месцам вельмі нагадвалі гучанне "Slade" і "Maanam"...

Беларускі бок у гэтай сумеснай "гучнай" акцыі было даручана прадставіць гурту "NRM". І гэта невыпадкова. Музыкі маюць вельмі трывалыя сувязі з польскімі творцамі па ўсёй Польшчы, гурт шмат гастралюе па краіне, польскія музыкі дапамагаюць "энэрэмаўцам" у запісах шматлікіх праектаў, што ажыццяўляюцца ўдзельнікамі "NRM". А ў рэпертуары лідараў беларускага андэграўнда ёсць некалькі прыгожых польскамоўных кампазіцый. Таму адносна кандыдатур на гэты канцэрт у арганізатараў імпрэзы пытанняў не ўзнікала з самага пачатку.

Разумеючы гэта, музыкі "N.R.M." зрабілі ўсё магчымае, каб акцыя прайшла ў сяброўскай, нават братняй атмасферы. Але беларускія хлопцы нагадалі, хто на гэтым канцэрце хэдлайнер. Адразу "энэрэмаўцы" выдалі некалькі сваіх "забойных" хітоў, якія прымусілі ўсіх прысутных успомніць лепшыя канцэрты гурта. "Трактар", "Паветраны шар", "Дзед Мароз" менская публіка ведае на памяць, і таму, напэўна, зрабіць гэта было лёгка. Асаблівы энтузіязм ахапіў публіку, калі выконвалася песня "Катуй-ратуй", ды-джэйскі мікст якой ужо шмат часу займае першае месца на сайце "Кока-колы" ды пастаянна гучыць у тэлеэфіры. Яшчэ больш музыкі заінтрыгавалі публіку сваім будучым альбомам і на канцэрце прагучала некалькі нумароў з яго: "Маё пакаленне", "Выбіраеш-выбірай", "Мяжа". Якім будзе гэтая новая праца гурта пакуль спрагназаваць нельга. Але першыя зацемкі зрабіць ужо можна. Чарговы альбом "N.R.M." абяцае стаць не меншай сенсацыяй, чым папярэдні – "Тры чарапахі" і, у той жа час, больш сталым і рэфлексіўным. Спадзяёмся, ён прынясе музыкам і творчае і матэрыяльнае задавальненне. Бо чакаецца, што ўдзельнікі гурта самі зоймуцца менэджментам свайго альбома.

Відавочна, што канцэрт "Тры палякі, грузін і сабакі" стаў нешараговай падзеяй у справе культурнага абмену паміж рок-музыкамі краін-суседак. Але фестываль "восень польскай культуры" ў Беларусі працягваецца. Менчукоў чакаюць новыя цікавыя выставы, творчыя семінары і сустрэчы, тэатральныя майстар-класы і прэм'еры.

Ну а што ж заяўлены ў праграме грузін? Яго публіка так і не дачакалася. Як і галоўнага героя п'есы Іянэскі "У чаканні Гадо"...

Анатоль Мяльгуй.

"Паэзіі радок чароўны"

Пад такой назвай болей за паўгода праводзіўся паэтычны конкурс, прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. За гэты час пяцьдзесят восем маладых літаратараў з усіх раёнаў вобласці даслалі свае падборкі вершаў. Некаторыя аўтары нават даслалі ўласныя невялічкія зборнікі: Віцебская гімназія № 4 даслала калектыўны зборнік, за што аўтары гэтага зборніка атрымалі лісты-падзякі за актыўны ўдзел у конкурсе. Лісты-падзякі таксама атрымалі самыя маладыя з усіх удзельнікаў. Гэта школьнікі, наведвальнікі гуртка "Паэтычная сцяжынка", якім кіруе Тадзіяна Фёдараўна Кляшторная.

Аўтарытэтнае журы у складзе паэтаў Вольгі Русілкі, Анатоля Канапелькі, Уладзіміра Панковіча, іншых віцебскіх паэтаў, прадстаўнікоў абласных упраўленняў адукацыі і культуры з усіх удзельнікаў у рознай ступені адзначыла васемнаццаць. Варта сказаць, што журы ўзначаліў старшыня Віцебскага адзялення Саюза пісьменнікаў Франц Іванавіч Сіўко. Праз некаторы час, падводзячы вынікі конкурсу, ён адзначыў: "Калі выступалі нашы лаўрэаты, якіх было сямёра, нашы дыпламанты, якіх было дзесяць, я міжволі парадваўся за тое, што не мялее рака творчасці".

Даўгачаканыя вынікі падводзіліся ў актавай зале віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. Большасць удзельнікаў, якія былі студэнтамі факультэта рускай філалогіі, адчувалі сябе ўтульна ў знаёмых абставінах. Дарэчы, многія сябры журы-гэта выкладчыкі кафедраў беларускай і рускай літаратураў. Але ўдзельнікамі і пераможцамі былі не толькі студэнты. Лаўрэатамі сталі адзінаццацікласніца з Шаркоўшчыны Надзея Шук і студэнтка ВДУ Алена Крыклівец (1-е месца); настаўніца СШ № 41 г. Віцебска Таццяна Карпечанка і студэнт ВДУ Арцём Арашонак (2-е месца); школьніца з г. п. Бягомль Докшыцкага раёна Наталля Навіцкая, настаўніца з Шаркоўшчынскага раёна Алена Шыпіла і студэнтка ВДУ Аляксандра Бабарыка (3-е месца).

Журы разгледзела болей за пяцьсот самых разнастайных вершаў. І пацвярджаючы гэта, са сцэны ў выкананні саміх канкурсантаў гучала грамадзянская, інтымная, пейзажная лірыка. Маляўнічае раскрыццё асенняга харавства было найболей актуальнае (свята праходзіла напрыканцы кастрычніка). І канешне ж, гучалі вершы, прысвечаныя нашым выдатным песнярам Янку Купалу і Якубу Коласу, іншым знакамітым майстрам беларускага слова. Сярод такіх твораў вельмі спадабаліся аўдыторыі прысвячэнні Уладзіміру Караткевічу. Выступленні маладых паэтаў чаргаваліся са словамі сяброў журы, якія іх узнагароджвалі: Зборнікі паэзіі; кнігі беларускіх класікаў, ганаровыя граматы былі ўручаны пераможцам. Між іншым, па словах саміх канкурсантаў, самай жаданай узнагародай стала запрашэнне на любы спектакль коласаўскага тэатра, якое атрымалі некаторыя ўдзельнікі вечараны.

Святочнасць адчувалася ва ўсім. Гэтаму садзейнічалі песні; што выконваліся на словы славутых юбіляраў, урывак са спектакля "Паўлінка", што завяршыў мерапрыемства. Прыўзнятай была і наступная сустрэча, што з'яўлялася своеасаблівым працягам конкурсу і праводзілася праз некалькі дзён. Некаторыя з пераможцаў выступалі з чытаннем сваіх вершаў цяпер ужо ў абласной бібліятэцы. Аўдыторыю складалі чытачы беларускай залы, гарадская інтэлігенцыя і школьнікі, якіх было найболей. Апошнія тут жа ўдзельнічалі ў цікавай вікта-рыне, што мела назву: "Ці ведаеце вы творчасць Купалы і Коласа?" Тыя, хто правільна адказаў на дзесяць пытанняў, ва ўзнагароду атрымалі кнігі.

У зале гучалі галасы песняроў у старых запісах. Голас Купалы, што чытае свой верш, голас Коласа, што выступае з прамовай. "Вельмі важна пачуць голас песняра і суаднесці яго з сваім уяўленнем аб чалавеку", - кажа Франц Сіўко, які, дарэчы, быў адныыым з вядучых урачыстасці. І зноў гучаць вершы. Сярод іх – літаратурныя пераклады ранняга Купалы на нямецкую мову, пераклады з замежных моў на беларускую.

Усіх зацікавіла выступленне віцебскага паэта, літаратуразнаўцы, дацэнта кафедры беларускай літаратуры ВДУ Анатоля Мікалаевіча Канапелькі. Ён расказаў пра ліст-запавет Якуба Коласа, які быў перададзены ўладам самім паэтам 13 жніўня 1956 года за колькі гадзін да ўласнай смерці. Апошнія словы паэта доўгі час не друкаваліся. У гэтым лісце беларускі класік з горыччу пісаў аб недастатковай увазе да беларускай мовы з боку грамадства. І ў гэтым, на думку Анатоля Мікалаевіча, выявілася прароцкасць Якуба Коласа, бо і для нашага часу такая з'ява вельмі характэрная.

Напрыканцы сустрэчы маладыя паэты дамовіліся хадзіць з выступленнямі ў гарадскія школы. Гэта дасць магчымасць і школьнікам далучацца да неміналеючай ракі творчасці на Віцебшчыне.

Ганна Навасельцава, студэнтка факультэта беларускай філалогіі і культуры ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск.

Прэзентацыя новай кнігі Зміцера Бартосіка

Нядаўна ў Менскай гарадской бібліятэцы імя Францішка Багушэвіча распачаўся новы сезон творчых сустрэч з вядомымі пісьменнікамі, артыстамі, мастакамі нашай краіны. І адкрыўся ён сустрэчай з пісьменнікам, бардам, супрацоўнікам газеты "Наша ніва" Зміцерам Бартосікам з нагоды выхаду яго зборніка апавяданняў пад каларытнай і дзіўнай назвай "Чорны пісталет", якая выйшла ў Вільні ў выдавецтве "Вострая брама"

Наталля Стрыгальская, супрацоўніца бібліятэкі, пачала сустрэчу словамі захаплення пра кнігу, напісаную дасканала і надзвычай цікава. Вядучая коратка расказала пра асноўныя матывы творчасці Зміцера, пра шырокае поле яго дзейнасці.

Далей прамаўляў Зміцер Бартосік, які даволі падрабязна расказаў пра сябе, узгадваў сваё маленства і юнацтва. Многіх здзівіла і захапіла тое, што ён, ураджэнец Ніжняга Ноўгарада, рускі, стаў размаўляць па-беларуску, абраўшы сабе шлях беларускага патрыёта, які аддае ўсе свае творчыя сілы і талент на карысць нашай краіны. Ён расказаў, як ствралася кніга, якія факты клаліся ў аснову ягоных апавяданняў.

Асабліва цікава і займальна было слухаць пра падарожныя прыгоды Зміцера, бо ён аб'ехаў усю Беларусь, Расію, шмат ведаў пра Вільню.

Галоўнымі ж тэмамі яго творчасці з'яўляецца наша жыццё, існая рэальнасць, з яе радасцямі і заганамі, дабрачыннасцю і злачыннасцю.

Было шмат пытанняў у слухачоў аб жыццёвай праўдзе яго апавяданняў. Тады пісьменнік проста адкрываў кнігу і чытаў свае апавяданні: "Сіняя царква", "Нешчаслівы білет" і іншыя.

Ад празаічнай часткі сустрэчы Зміцер перайшоў да лірычнай. Прысутныя пачулі ў яго выкананні песні "Дарога на Вільню", "Горадня 1795", "Памяці забытага службоўца", "Развітанне з Вільняй" і яшчэ шмат іншых. Яго песні вызначаюцца глыбокай пранікнёнасцю і лірызмам.

Госць узгадваў сваіх калег – бардаў, любімых пісьменнікаў, пастаянна цытуючы іх выказванні ў яго адрас, тым самым адказваючы на шматлікія пытанні прыхільнікаў свайго таленту.

У канцы сустрэчы многія набылі новую кнігу Зміцера Бартосіка "Чорны пісталет" з аўтографам аўтара.

Вечарына прайшла ў духу любові да Беларусі і яе культуры. Яна прынесла ўсім прысутным вялікае маральнае задавальненне. Хочацца сказаць вялікі дзякуй Зміцеру Бартосіку і арганізатарам гэтай цікавай сустрэчы.

Андрэй Грыгаровіч, навучэнец Менскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа № 1.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by
http://tbm.org.by/ns/

Рэдакцыйная калегія:
Алена Анісім, Вадзім Болбас,
Міхась Булавацкі, Людміла Дзіцэвіч,
Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш,
Язэп Палубятка,
Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун,
Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік,
Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 9. 12. 2002 г.
Наклад 2500 асобнікаў. Замова № 2387.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 489 руб., 3 мес.- 1467 руб.
Кошт у розніцу: 120 руб.